УДК 81'373.48

# СТЭРЭАТЫПЫ Ў ПЕДАГАГІЧНЫМ ДЫСКУРСЕ: ЗА ЦІ СУПРАЦЬ?

*Аніськова С.М.,*
*Гомель, УА "ГДУ імя Ф.Скарыны"*

Феномен "стэрэатып" можа разглядацца ў кантэксце розных галін ведаў: псіхалогіі, сацыялогіі, лінгвістыкі і этналінгвістыкі.

З'яўляючыся адным з базавых паняццяў гэтых навук, паняцце" стэрэатып" вызначаецца сваей папулярнасцю і разнастайнасцю трактовак. У большасці работ стэрэатып разглядаецца ў рэчышчы сацыяльнага ўзаемадзеяння як пэўная "мадэль" паводзін. Ю.Е.Прахараў "стэрэатыпамі маўленчых паводзін" называе "сацыякультурную маркіраваную адзінку ментальна-лінгвальнага комплексу прадстаўніка пэўнай этнакультуры, рэалізуемую ў маўленчых зносінах у выглядзе нарматыўнай лакальнай асацыяцыі да стандартнай для данай культуры сітуацыі зносін" [1, с. 10 ]. Пры такім разуменні стэрэатыпу ен выступае як "узор", "канон".

Маўленчыя стэрэатыпы, такім чынам, арганізуюць стэрэатыпную камунікатыўную сітуацыю ў межах любога дыскурсу.

У педагагічным дыскурсе маўленчыя стэрэатыпы разглядаюцца як " дыскурсіўныя маркеры , якія, выконваючы метакамунікатыўную функцыю, служаць размеркаванню інфармацыі (вучэбнай і арганізацыйнай), сігналізуючы пра ўстанаўленне рэферэнцыяльных сувязей (пра здзейснены адрасантам рэферэнцыяльны выбар у ходзе разгортвання тэксту), з аднаго боку, і актывізуючы ўспрыманне інфармацыі рэцыпіентамі—з другога" [2,с.75].

Важная прымета маўленчых стэрэатыпаў— іх прагматычная аснова. У маўленні выкладчыка яны з'яўляюцца своеасаблівымі "камунікатыўнымі фразеалагізмамі прэцэдэнтнага характару"[3,с.128]. Маўленчыя стэрэатыпы, з пункту гледжання лінгвістыкі, — гэта семантычна стабільная дыскурсіўная формула, якая выкарыстоўваецца для выражэння найбольш тыповых вербальных рэакцый у канкрэтных сацыяльна абумоўленых " навучальных " сітуацыях з мэтай эканоміі моўных сродкаў .

Маўленчыя стэрэатыны, якія выкарыстоўвае выкладчык, у выніку рэалізуюць мэтакамунікатыўную функцыю , гэта значыць арганізуюць інтэракцыяльную прастору камунікацыі, паколькі з'яўляюцца дэйктычнымі адзінкамі, што ўказваюць на пэўныя сітуацыі маўленчых зносін і парадак іх спараджэння .

Паводле М.Ю.Алешкава, у межах інтэнцыяльнага падыходу вылучаюць некалькі груп маўленчых стэрэатыпаў, якія актыўна выкарыстоўваюцца выкладчыкам у камунікатыўнай прасторы заняткаў:

1. стэрэатыпы-кантакты (Добры дзень, сядайце!);
2. стэрэатыпы- пытанні (Хто адкажа?);
3. стэрэатыпы-імператывы (Іваноў, да дошкі!) Звернем увагу на дошку!);
4. стэрэатыпы-пажаданні (У наступны раз рыхтуйся лепей!);
5. стэрэатып-канстатацыя (Зноў не падрыхтаваўся! Дрэнна!);
6. стэрэатыпы-згоды (Так! Правільна! Згодна!);
7. стэрэатыпы- нязгоды (Не! Не так! Няправільна!) [2,с.80].

Педагагічны дыскурс вызначаецца не толькі яго жорсткай регламентаванасцю, але і аксіялагічным патэнцыялам як адной з характэрных уласцівасцей: выкладчык-адрасант выступае транслятарам каштоўнага зместу і ў той жа час ен рэалізуе ў маўленчых паводзінах каардынуючую функцыю, гэта значыць выкладчык-удзельнік педагагічнацй камунікацыі з'яўляецца таксама каардынатарам паміж дзейнасцю студэнта і аксіялагічным ідэалам, эталонам, узорам, прынятымі ў грамадстве.

Прыведзены ілюстрацыйны матэрыял дазваляе гаварыць пра наступныя ўласцівасці маўленчага стэрэатыпу:

1. адпаведнасць псіхалагічным стэрэатыпам як адлюстраванне ў свядомасці часта паўтаральных з'яў рэчаіснасці;

2. легкая ўзнаўляльнасць гатовых маўленчых формаў;

3.аўтаматызацыя працэсу ўзнаўляльнасці;

4.эканомія намаганняў, мысленчай энергіі і часу, як для выкладчыка, так і для студэнта.

Найбольш частотнымі (традыцыйнымі, звыклымі) сталі такія стэрэатыпныя выказванні:

А) са значэннем адабрэння:

-Малайчына!

-Прыемна правяраць такі сшытак!

-Добра, сядай!

-Выдатна! Цудоўна! Бліскуча!

-Так!

-Дзякую! Дзякую за адказ! Так, дзякую!

Б) са значэннем неадабрэння:

-Вы зноў нічога не вучыце! Як экзамены здаваць збіраецеся?

-Ну колькі можна размаўляць на занятках?

-Такая падрыхтоўка не вытрымлівае ніякай крытыкі!

-Я што сценам расказваю?

-Гэта пераходзіць усе межы!

-Такая падрыхтоўка нікуды не вартая!

-Я чакала лепшага!

-Трэба было дома вывучыць!Я ж не ўчора задавала!

-Дрэнна!

Спектр маўленчых стэрэатыпаў стварае маўленчы партрэт не толькі кантрэтнага выкладчыка, але і любога прадстаўніка данай прафесіі. Аднак менавіта трафарэтнасць і шаблоннасць маўленчай рэалізацыі намераў выкладчыка прыводзяць іншы раз да з'явы дэаксіялагізацыі, што абцяжарвае інтэрпрэтатыўную дзейнасць адрасата, а значыць пярэчыць адной з важных умоў пасяховай сацыяльнай камунікацыі—ролевай адэкватнасці камунікатыўных паводзін.[4,с.76]

Такім чынам, стэрэатыпы як неабходны і важны элемент педагагічнага дыскурсу, з аднаго боку, каардынуюць сітуацыю камунікацыі, а з другога, зніжаюць эфектыўнасць гэтай камунікацыі, калі парушаецца мэтазгоднасць, дарэчнасць і частотнасць іх выкарыстання. Працаваць над словам рупна і нястомна— задача кожнага выкладчыка! І не толькі выкладчыка!

Спіс літаратуры

1. Прохоров, Ю. Е. Национальные социокультурные стереотипы речевого общения и их роль при обучении русскому языку иностранцев / Ю. Е. Прохоров. – М.: Изд-во ИКАР, 1997. - 228 с.
2. Олешков, М. Ю.Речевое клише в педагогическом дискурсе/М.Ю.Олешков //Вестник МГЛУ., 2010г.-№2(45).Филология.-С.73-80.
3. Сорокин, Ю. А. Стереотип, штамп, клише: к проблеме определения понятий / Ю. А. Сорокин // Общение. Теоретические и прагматические проблемы. —М., 1978. – С. 125-131.
4. Матевосян, Л. Б. Стереотипное высказывание как психо- и социолингвистический феномен / Л. Б. Матевосян // Филологические науки. – 1994, № 2. – С. 71 – 79.